# § 25. Гарадское і сельскае насельніцтва

***Узгадваем.*** *Якія тыпы паселішчаў існуюць у свеце? Што такое ўрбанізацыя?*

**Гарадское і сельскае насельніцтва.** Колькасць гарадскіх жыхароў і іх доля ў агульнай колькасці насельніцтва пастаянна павялічваецца, што адпавядае сусветнай тэндэнцыі ўрбанізацыі. Індустрыялізацыя, навукова-тэхнічны прагрэс, рост адукацыйнага і культурнага ўзроўню насельніцтва ў XX ст. актывізавалі міграцыю жыхароў з сельскай мясцовасці ў гарады. Але ў канцы XX ст. гэты працэс запаволіўся. Тым не менш гарады застаюцца цэнтрамі эканамічнага жыцця і навукова-тэхнічнага прагрэсу, навукі, абслугоўвання, інфармацыі, культуры і г. д. Праўда, тычыцца гэта ў асноўным буйных і сярэдніх гарадоў, у той час як перад жыхарамі малых гарадоў існуюць праблемы працаўладкавання і адпачынку.

Паводле перапісу насельніцтва 2009 г., у Беларусі ў гарадах пражывала 74 % людзей, у цяперашні час — 78 %. Доля сельскага насельніцтва ўсяго 22 %. *Як вы думаеце, чаму доля гарадскога насельніцтва павялічваецца, а сельскага — памяншаецца?* Самая высокая доля гарадскога насельніцтва ў Магілёўскай і Мінскай (з Мінскам) абласцях, самая нізкая — у Брэсцкай.

Сельскае насельніцтва на мяжы XX–XXI стст. значна знізіла сваю долю ў агульнай колькасці насельніцтва краіны. Прычынамі гэтага сталі канцэнтрацыя вытворчага і жыллёвага будаўніцтва ў гарадах, адрозненні ўмоў жыцця ў гарадах і сельскай мясцовасці. Адток сельскіх жыхароў у гарады істотна пагоршыў узроставую структуру сельскага насельніцтва: стала менш моладзі, узрасла доля асоб пенсійнага ўзросту. Сёння праводзіцца комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на збліжэнне горада і вёскі, развіццё сацыяльнай сферы, паляпшэнне ўмоў жыцця і добраўпарадкаванне сельскіх паселішчаў.

Асваенне тэрыторыі прывяло да фарміравання пэўнай сістэмы **рассялення**, якая складаецца з сеткі населеных пунктаў. Населеныя пункты звязаны паміж сабой вытворчымі, гандлёвымі, культурнымі і іншымі адносінамі. Яны адрозніваюцца асаблівасцямі месцазнаходжання, колькасцю жыхароў, гаспадарчымі функцыямі, планіроўкай і г. д.

**Рассяленне** — працэс размеркавання і пераразмеркавання насельніцтва па тэрыторыі са стварэннем сеткі паселішчаў.

**Гарадское рассяленне і тыпы гарадоў.** Пачынаючы са старажытных часоў, на тэрыторыі Беларусі фарміруецца сістэма рассялення. Сельскагаспадарчае асваенне тэрыторыі абумовіла фарміраванне сельскіх

паселішчаў. Пазней узнікаюць гарадскія паселішчы, насельніцтва якіх займалася рамесніцкай дзейнасцю і гандлем. Першыя гарады ўзнікалі на скрыжаванні транспартных шляхоў. Сярод іх такія старажытныя гарады, як *Полацк*, Заслаўе, Тураў, Браслаў, *Брэст*, *Віцебск*, *Магілёў*, Копысь, Лагойск, *Мінск*, Орша, Пінск, *Барысаў*, *Слуцк*, *Кобрын*, *Рэчыца*, *Слонім*. *Узгадайце паходжанне назваў старажытных гарадоў Беларусі.*

На працягу гістарычнага развіцця колькасць гарадскіх паселішчаў і колькасць жыхароў у іх няўхільна расла. У цяперашні час у Беларусі 201 горад і пасёлак гарадскога тыпу. У залежнасці ад колькасці насельніцтва і эканамічнага патэнцыялу яны ўплываюць на развіццё іншых паселішчаў.

У другой палове XX ст. у Беларусі на месцы будаўніцтва буйных прамысловых прадпрыемстваў з'явіліся новыя, маладыя гарады: Белаазёрск, *Жодзіна*, Новалукомль, *Наваполацк*, *Салігорск* і *Светлагорск* (мал. 102).



Мал. 102. Горад Салігорск

Да гарадскіх паселішчаў у Беларусі, акрамя гарадоў, адносяцца *пасёлкі гарадскога тыпу*, *рабочыя* і *курортныя пасёлкі*. Яны адрозніваюцца меншай колькасцю насельніцтва і меншай колькасцю гаспадарчых функцый. Некаторыя пасёлкі гарадскога тыпу могуць мяняць статус. У 2012 г. пасёлку гарадскога тыпу Астравец быў прысвоены статус горада. *Чаму п. г. т. Астравец атрымаў статус горада?* У 2016 г. п. г. т. Круглае і Бялынічы таксама атрымалі статус гарадоў, і ў 2017 г. у краіне ўжо налічвалася 115 гарадоў.

У залежнасці ад колькасці жыхароў гарады ў рэспубліцы падзяляюцца на малыя (да 20 тыс. чал.), сярэднія (20–100 тыс.) і вялікія (звыш 100 тыс. чал.). Сярод вялікіх вылучаюць буйныя (100–500 тыс. чал.), буйнейшыя (больш за 500 тыс. чал.) і гарады-мільянеры (больш за 1 млн чал.).

У нашай краіне адзіным горадам-мільянерам з'яўляецца сталіца — Мінск. *Гомель* (535 тыс.) адносіцца да катэгорыі буйнейшых гарадоў, а астатнія абласныя цэнтры і некаторыя раённыя — да буйных гарадоў. Менавіта яны сёння займаюць вядучае месца ў сістэме рассялення і аказваюць уплыў на развіццё іншых тыпаў паселішчаў. Каля 15 % гарадскога насельніцтва пражывае ў сярэдніх гарадах са своеасаблівай архітэктурай і вытворча-культурным патэнцыялам.

Выкарыстоўваючы карты атласа (с. 29), знайдзіце буйныя гарады, якія не з'яўляюцца абласнымі цэнтрамі, і прывядзіце прыклады сярэдніх гарадоў.

Па колькасці пераважаюць малыя гарады (65 % гарадскіх паселішчаў), якія з'яўляюцца цэнтрамі адміністрацыйных раёнаў. Іх развіццё звязана з наяўнасцю прамысловых прадпрыемстваў, у асноўным харчовай прамысловасці. Аднак некаторыя прадпрыемствы ў цяперашні час з'яўляюцца стратнымі або працуюць няўстойліва.

Гарады на тэрыторыі Беларусі размешчаны ў асноўным раўнамерна.

Многія гарады размяшчаюцца ўздоўж транспартных калідораў, на берагах рэк і азёр, паблізу радовішчаў карысных выкапняў. Чым тлумачыцца такое размяшчэнне гарадоў?

Напрыканцы XX ст. асаблівае месца ў рассяленні занялі **гарады-спадарожнікі**.

**Горад-спадарожнік** — горад ці пасёлак гарадскога тыпу, які знаходзіцца і развіваецца не далей 30 км ад буйнога горада ці буйнога прадпрыемства і складае з ім адзіную эканамічную і дэмаграфічную сістэму.

Гарадамі-спадарожнікамі Мінска з'яўляюцца Лагойск, Дзяржынск, Фаніпаль, Заслаўе, Смалявічы і Рудзенск; Брэста — Жабінка; *Гродна* — Скідзель. Канцэнтрацыя гарадоў-спадарожнікаў вакол пэўнага цэнтра прыводзіць да ўтварэння агламерацыі, напрыклад *Мінскай*.

**Сельскае рассяленне.** Размяшчэнне сельскіх населеных пунктаў, як правіла, залежыць ад прыродных умоў. Іх колькасць большая ў месцах са спрыяльнымі ўмовамі для сельскагаспадарчага асваення тэрыторыі.

Сельскае насельніцтва краіны пражывае ў 23 100 населеных пунктах. У сярэднім на адзін сельскі населены пункт прыходзяцца 103 жыхары, а адлегласць паміж пунктамі складае 2,8 км. За 60 апошніх гадоў сельская мясцовасць страціла па розных прычынах больш за 4 млн чалавек. *Чым пагражае Беларусі далейшае скарачэнне сельскага насельніцтва?*

У розныя часы на тэрыторыі Беларусі існавалі такія тыпы сельскіх паселішчаў, як сёлы, вёскі, хутары. *Чым адрозніваюцца гэтыя сельскія паселішчы?* На цяперашні час хутары зніклі, а колькасць малых вёсак скарацілася. Многія малыя вёскі аб’ядналіся ў больш буйныя.

З 2005 г. некаторыя сельскія паселішчы ў рэспубліцы сталі ператварацца ў **аграгарадкі** (мал. 103). Паняцце «аграгарадок» з’явілася ў Беларусі ў сувязі з прыняццем «Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі на 2005–2010 гг.». Аграгарадкі ствараюцца на аснове сельскіх паселішчаў. У цяперашні час у краіне 1481 аграгарадок.


Мал. 103. Аграгарадок Любань Вілейскага раёна

**Аграгарадок** — добраўпарадкаваны сельскі населены пункт з вытворчай і сацыяльнай інфраструктурай для забеспячэння сацыяльных стандартаў насельніцтву, якое ў ім пражывае.

Сельскае рассяленне характарызуецца двума паказчыкамі: 1) люднасцю, або велічынёй населеных пунктаў па колькасці жыхароў, і 2) гушчынёй сельскіх паселішчаў у разліку на 100 км$^2$. Першы з іх на тэрыторыі Беларусі ў напрамку з поўначы на поўдзень узрастае, а другі, наадварот, памяншаецца. *Чым можна растлумачыць такія змены паказчыкаў па тэрыторыі?*

**Абагульнім і запомнім.** У Беларусі ў гарадскіх пасяленнях пражывае 78 % жыхароў. У краіне 201 горад і пасёлак гарадскога тыпу. Адзіным горадам-мільянерам з’яўляецца Мінск. З 2005 г. сельскія паселішчы сталі ператварацца ў аграгарадкі.

1. Чаму колькасць гарадскога насельніцтва большая, чым сельскага? 2. Назавіце старажытныя і самыя маладыя гарады Беларусі. 3. На якія тыпы падзяляюцца гарады ў залежнасці ад выконваемых функцый? 4. Што такое аграгарадок?

5. У чым сутнасць змен у рассяленні, якія адбываюцца ў Беларусі ў сучасны перыяд? 6. Якая роля ў развіцці краіны адводзіцца Мінскай агламерацыі? 7. Які прагноз можна зрабіць у дачыненні да змен у рассяленні на блізкую і далёкую перспектыву?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Распрацуйце рэкламны буклет «Сучасны горад Беларусі».